ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 25 (275) | Субота, 18 верасня 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.

## У ПАЛЁЦЕ—«САЮЗ-22»

### ПАВЕДАМЛЕННЕ ТАСС

15 верасня 1976 года ў 12 гадзін 48 мінут па маскоўскаму часу ў Савецкім Саюзе зроблены запуск касмічнага карабля «Саюз-22», пілатуемага экіпажам у саставе камандзіра карабля Героя Савецкага Саюза, лётчыка-касманаўта СССР палкоўніка Быкоўскага Валерыя Фёдаравіча і бортінжынера Аксёнава Уладзіміра Віктаравіча.

Асноўнай мэтай палёту касмічнага карабля «Саюз-22», праводзімага па праграме супрацоўніцтва сацыялістычных краін у галіне даследавання і выкарыстання касмічнай прасторы ў мірных мэтах, з'яўляецца адпрацоўка і ўдасканаленне навукова-тэхнічных метадаў і сродкаў вывучэння з космасу геолага-геаграфічных характарыстык паверхні Зямлі ў інтарэсах народнай гаспадаркі. Для вырашэння гэтых задач на борце касмічнага карабля ўстаноўлена шматзанальная фотаапаратура, распрацаваная спецыялістамі ГДР і СССР і вырабленая на народным прадпрыемстве «Карл Цэйс Йена» ў ГДР.

Праграмай палёту прадугледжваецца таксама выкананне навукова-тэнічных, медыка-біялагічных даследаванняў і эксперыментаў.

З экіпажам карабля «Саюз-22» падтрымліваецца ўстойлівая радыё- і тэлевізійная сувязь.

Кіраванне палётам касмічнага карабля «Саюз-22» і апрацоўка паступаючай інфармацыі ажыццяўляюцца савецкім Цэнтрам кіравання з дапамогай станцый сачэння, размешчаных на тэрыторыі Савецкага Саюза, і навукова-даследчых суднаў, якія знаходзяцца ў розных раёнах акваторыі Атлантычнага акіяна.

Самаадчуванне касманаўтаў В. Ф. Быкоўскага і У. В. Аксёнава добрае, бартавыя сістэмы карабля працуюць нармальна. Касманаўты таварышы Быкоўскі і Аксёнаў пачалі выкананне праграмы палёту.

## ЭКІПАЖ КАРАБЛЯ САЮЗ-22 ФАТАГРАФУЕ ЗЯМЛЮ

**Цэнтр кіравання палётам,** 16. (ТАСС) Да 12 гадзін маскоўскага часу касмічны карабель «Саюз-22» зрабіў 16 абаротаў вакол Зямлі.

Рабочы дзень экіпажа пачаўся сёння ў 7 гадзін. Пасля медыцынскага кантролю і снедання касманаўты В. Ф. Быкоўскі і У. В. Аксёнаў завяршылі падрыхтоўку шматзанальнай фотаапаратуры да правядзення здымкі.

Першая серыя фатаграфавання зямной паверхні ў інтарэсах навукі і народнай гаспадаркі была выканана, калі касмічны карабель рабіў палёт над раёнамі Усходняй Сібіры.

Па праграме навуковых даследаванняў экіпаж пачаў выконваць біялагічны эксперымент па вывучэнню ўплыву фактараў касмічнага палёту на развіццё вышэйшых раслін.

Самаадчуванне таварышаў Быкоўскага і Аксёнава добрае. Палёт касмічнага карабля «Саюз-22» праходзіць у адпаведнасці з праграмай.

## НА ПРАКТЫЦЫ— ПОЛЬСКІЯ СТУДЭНТЫ

Цесныя сувязі ўстанавіліся паміж ГДУ і Інстытутам рускай славяністыкі Кракаўскай вышэйшай педагагічнай школы. Гэтаму садзейнічае абмен студэнцкімі групамі, якія прыязджаюць з адной краіны ў другую для праходжання вытворча-азнаямленчай практыкі.

Мінулым летам, як і ў папярэднія гады, студэнты нашага ўніверсітэта наведалі Польшчу. У верасні ж, польскія студэнты прыбылі ў Гомель. Спачатку для іх была наладжана сустрэча ў рэктараце, дзе госці змаглі падрабязна азнаёміцца з пастаноўкай вучэбна-выхаваўчага працэсу ў ГДУ, яго развіццём. Затым яны пабывалі на гісторыка-філалагічным факультэце, яго кафедрах.

Ва ўніверсітэце паклапаціліся аб тым, каб практыка польскіх сяброў прайшла на самым высокім узроўні. Шмат часу яны працуюць над магістарскімі (дыпломнымі) работамі ў чытальнай зале абласной бібліятэкі імя У. І. Леніна.

У вольны час для польскіх студэнтаў наладжваліся цікавыя экскурсіі. Яны добра пазнаёміліся з Гомелем, наведалі абласны краязнаўчы музей і музей Вялікай Айчыннай вайны, пабывалі ў планетарыі, на цеплаходзе зрабілі прагулкі па Сажы, прайшлі партызанскімі сцежкамі.

У дні знаходжання ў нашай краіне польскія студэнты наведаюць Маскву і Ленінград.

**П. ЖУРАЎСКІ,**
**дацэнт, кіраўнік практыкі польскіх студэнтаў.**

## ВЫСОКАЯ ЎЗНАГАРОДА Я. ГАЎРЫЛЕНКІ

**Прэзідыум Вярхоўнага Савета СССР за высокія спартыўныя дасягненні на XXI летніх Алімпійскіх гульнях узнагародзіў ордэнамі і медалямі СССР вялікую групу спартсменаў, трэнераў і работнікаў фізічнай культуры і спорту. Сярод удастоеных урадавых узнагарод група спартсменаў і работнікаў фізічнай культуры і спорту Беларусі.**

Высокай узнагароды — медаля «За працоўную адзнаку» — удастоены выпускнік нашага ўніверсітэта, майстар спорту міжнароднага класа Яўген Гаўрыленка, які заваяваў у Манрэалі бронзавы медаль у бегу на 400 м з перашкодамі.

## НА ДАПАМОГУ ПРАЦАЎНІКАМ ВЁСКІ

У першым годзе юбілейнай, дзесятай пяцігодкі калгаснікі і рабочыя саўгасаў, ажыццяўляючы гістарычныя рашэнні XXV з'езда КПСС, прыкладаюць шмат намаганняў, каб з поспехам выканаць высокія сацыялістычныя абавязацельствы. Багаты ўраджай большасці сельскагаспадарчых культур забяспечылі хлебаробы. Добра ўрадзіла сёлета і бульба, уборка якой з'яўляецца самай працаёмкай. Каб не дапусціць яе страт, патрэбна шмат рабочых рук. Туды, дзе іх мала, на дапамогу прыходзяць шэфы, у тым ліку і студэнты. Так, выхаванцаў нашага ўніверсітэта паклікалі палеткі Акцябрскага, Петрыкаўскага, Жыткавіцкага і Калінкавіцкага раёнаў.

Перад адпраўкай у гаспадаркі студэнты сабраліся ў мінулы панядзелак каля сваіх вучэбных карпусоў. З самага ранку тут гучалі вясёлыя галасы, панаваў добры настрой. Гэтаму садзейнічала ўстанавіўшаеся цёплае сонечнае надвор'е, натхняючыя словы, з якімі партком, рэктарат, камітэт ЛКСМБ і прафком звярнуліся ў шматтыражнай газеце «Гомельскі ўніверсітэт» да студэнтаў, ад'язджаючых на сельскагаспадарчыя работы. Па ўсім адчувалася, што ў адказ на іх студэнцкая моладзь поўна рашучасці прадэманстраваць узоры самаадданай працы, з гонарам апраўдаць ускладваемыя на яе надзеі.

У многіх групах можна было бачыць рабят з гітарамі. І гэта натуральна. Гітара ўсюды з'яўляецца лепшым спадарожнікам моладзі. Тым больш, калі пастаўлена задача не толькі актыўна дапамагаць працаўнікам вёскі на ўборцы ўраджаю, але і быць прыкладам у культурным жыцці.

13 верасня адзін за другім адпраўляліся ад універсітэта аўтобусы са студэнтамі, у адрас якіх гучалі цёплыя словы і найлепшыя пажаданні. Многія юнакі і дзяўчаты выехалі ў гаспадаркі Гомельшчыны чыгуначным транспартам. Выехалі, каб зноў заваяваць шчырую хлебаробскую ўдзячнасць за аказаную дапамогу.



**НА ЗДЫМКУ: група студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта перад ад'ездам у Петрыкаўскі раён.**

## ВЫСОКАЕ НАПРУЖАННЕ З ПЕРШАГА ДНЯ

У прыёмным пакоі рэктарата на перыяд сельскагаспадарчых работ створаны своеасаблівы штаб. Яго ўзначальвае прарэктар па вучэбнай рабоце дацэнт Д. А. Лявончанка. Яго аператыўнымі памочнікамі з'яўляюцца супрацоўнікі ўніверсітэта А. І. Рыбін і М. М. Шыршоў. У іх абавязкі ўваходзіла падрыхтоўка і размеркаванне студэнцкіх груп па калгасах і саўгасах вобласці, а цяпер яны наладжваюць сістэматычны кантроль за ходам сельскагаспадарчых работ, сабіраюць аб гэтым неабходную інфармацыю.

За сталом — А. І. Рыбін. Перад ім — графікі, спісы груп, іншыя дзелавыя паперы. Аляксандр Іванавіч расказвае, што ў 26 гаспадарак вобласці выехала больш 1500 студэнтаў 2—4 курсаў універсітэта. На другі ж дзень штаб працоўных спраў звязаўся па тэлефону з начальнікам сельскагаспадарчых упраўленняў Акцябрскага, Петрыкаўскага і Калінкавіцкага раёнаў. Атрымана паведамленне аб тым, што ўсе студэнты даехалі ў гаспадаркі добра. Паўсюдна для іх створаны належныя ўмовы для плённай працы і здаровага, культурнага адпачынку.

Аб першых працоўных днях паступілі звесткі і ад кіраўнікоў груп. В. Марчанка з біялагічнага факультэта перадаў у штаб працоўных спраў, што іх з вялікай цеплынёй сустрэлі рабочыя саўгаса «III Інтэрнацыянал» Жыткавіцкага раёна. Уладкаваўшыся, рабяты адразу ж узяліся за справу: працавалі на падборцы бульбы, пагружалі зерне. З першага дня студэнты паказалі вялікую стараннасць.

З камсамольскім запалам працуюць студэнты біялагічнага факультэта ў саўгасе «Другая пяцігодка» і калгасе імя Леніна таго ж раёна. Аб гэтым паведамілі кіраўнікі груп выкладчыкі В. Родзікаў і Р. Маркелава.

На наступным тыдні ў гаспадаркі, дзе працуюць нашы студэнты, выедуць прадстаўнікі рэктарата, парткома, дэканатаў, прафсаюзных і камсамольскіх арганізацый. Іх задача — усямерна садзейнічаць высокапрадукцыйнай рабоце студэнцкай моладзі, таму, каб сярод сельскіх працаўнікоў яна зарэкамендавала сябе з самага лепшага боку.

## ІДЗЕ ПАДПІСКА НА ГАЗЕТЫ І ЧАСОПІСЫ

### ДЗЕСЯТКАМІ ЭКЗЕМПЛЯРАЎ

Як толькі пачалася падпіска на перыядычныя выданні нова-га, 1977 года, ва ўніверсітэце адразу ж былі зацверджаны грамадскія распаўсюджвальнікі друку. На кафедрах грамадскіх дысцыплін гэту важную справу даручылі старшай лабарантцы кафедры палітэканоміі С. Салаўёвай. На сённяшні дзень яна ўжо аформіла падпіску больш чым на 50 чалавек. У новым годзе многія выкладчыкі будуць атрымоўваць самыя разнастайныя выданні. Так, загадчык кафедры педагогікі і псіхалогіі І. Ф. Харламаў выпісаў газеты «Правда», «Известия», «Литературная газета», «Учительская газета», «Настаўніцкая газета», «Сельская газета», часопісы «Коммунист», «Советская педагогика», «Вопросы психологии», «Народное образование», «Народная асвета» і іншыя— усяго 21 назва. На 20 выданняў аформіў падпіску прафесар кафедры філасофіі М. І. Рубцоў. Кожны дзень будзе поўнай паштовая скрынка ў падпісчыкаў з кафедр грамадскіх дысцыплін У. С. Сідарава, А. П. Мяшчэрскага, В. М. Бярэзіна, Я. П. Кульбацкага, Л. А. Цяцерынай, М. М. Маёрава, У. Ф. Бондарава і іншых.

Актыўна ідзе падпіска на перыядычныя выданні 1977 года таксама ў іншых падраздзяленнях універсітэта.

З УНІВЕРСІТЭЦКАЙ КАНФЕРЭНЦЫІ ДТСААФ

# ЗАМАЦОЎВАЦЬ ДАСЯГНУТАЕ

Рабоце канферэнцыі папярэднічалі справаздачна-выбарныя сходы факультэцкіх арганізацый ДТСААФ. Яны прайшлі ў першыя дні верасня. На мінулым тыдні ў пятніцу 132 дэлегаты сабраліся на агульнаўніверсітэцкую канферэнцыю пярвічнай арганізацыі абароннага таварыства, каб абмеркаваць свае дасягненні за справаздачны перыяд, вызначыць канкрэтныя задачы на будучае.

З дакладам выступіў старшыня камітэта ДТСААФ **У. А. Дзем'янкоў**. Ён падрабязна прааналізаваў работу камітэта абароннага таварыства за справаздачны перыяд, падкрэсліўшы, што яна была накіравана на паспяховае выкананне гістарычных рашэнняў XXIV і XXV з'ездаў КПСС і VII Усесаюзнага з'езда ДТСААФ. Асаблівая ўвага была звернута ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў.

Усю сваю работу камітэт ДТСААФ праводзіў пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйнай арганізацыі, у цесным кантакце з камсамолам і прафсаюзам.

Дакладчык адзначыў, што за справаздачны перыяд выкладчыкамі ўніверсітэта, а таксама лектарамі гарадской арганізацыі таварыства «Веды» было прачытана для студэнтаў 26 лекцый. За гэты час адбылося 16 цікавых сустрэч з ветэранамі вайны і працы, праведзены два масавыя паходы да былой партызанскай стаянкі атрада «Бальшавік» у «Крынічку» і да месца загінуўшых воінаў у раён Клёнак. Вялікае выхаваўчае значэнне меў і «Зорны» лыжны паход па памятных мясцінах, дзе праходзілі баі партызан. Удзельнікі турпахода сустрэліся з удзельнікамі гэтых баёў і іншымі народнымі мсціўцамі, якія змагаліся супраць гітлераўскіх акупантаў.

Ва ўніверсітэце шырокае развіццё набылі ваенна-тэхнічныя і ваенна-прыкладныя віды спорту. Студэнты з вялікай карысцю займаюцца ў радыёгуртку, мотагуртку, у секцыях па стралковаму, парашутнаму спорту і марскому мнагабор'ю. Нашы спартсмены рэгулярна выступаюць у розных спаборніцтвах і, як правіла, заўсёды займаюць прызавыя месцы. Паспяхова выконваюцца планавыя заданні па падрыхтоўцы спартсменаў-разраднікаў.

Пярвічная арганізацыя ДТСААФ універсітэта ўжо не першы год утрымлівае першынство ў Гомелі і вобласці па распаўсюджванню латарэі абароннага таварыства.

Аднак, як зазначалася ў дакладзе, дасягнутае ўчора сёння ўжо не можа задавальняць. Трэба настойліва імкнуцца да новых вышынь, пераадольваць усе перашкоды і ўхіляць меўшыя месца недахопы, якія не дазвалялі дабіцца больш значных вынікаў.

На справаздачна-выбарнай канферэнцыі ў абмеркаванні даклада прынялі ўдзел старшыні камітэтаў ДТСААФ факультэтаў. Яны расказалі аб тым, як пастаўлена абаронна-масавая і ваенна-патрыятычная работа ў падраздзяленнях універсітэта, звярнулі ўвагу дэлегатаў на асобныя недахопы. Ва ўніверсітэце яшчэ недастаткова праводзіцца спаборніцтваў па стральбе і радыёспорту. Па гэтых відах няма масавасці і пры здачы норм комплексу ГПА.

Сакратар камітэта ЛКСМБ **М. Сянькевіч** пакрытыкаваў у сваім выступленні камітэт ДТСААФ, мясцком і савет ветэранаў вайны за тое, што да гэтага часу яны не дабіліся, каб ва ўніверсітэце быў створаны пакой баявой і працоўнай славы.

Старшыня мясцкома **А. В. Саннікава** падкрэсліла неабходнасць далейшага ўмацавання сувязей арганізацыі абароннага таварыства з прафсаюзнымі і камсамольскімі арганізацыямі.

На канферэнцыі выбраны новы састаў камітэта ДТСААФ у саставе 25 чалавек. Старшынёй камітэта ДТСААФ выбраны **У. А. Дзем'янкоў**, яго намеснікамі — **П. У. Жукаў** і **М. П. Старасценка**.

У рабоце справаздачна-выбарнай канферэнцыі прынялі ўдзел сакратар парткома ўніверсітэта **У. В. Казлоў**, намеснік старшыні АК ДТСААФ **В. М. Бурмістраў**. Яны пажадалі новаму саставу камітэта ДТСААФ поспехаў у рабоце і ажыццяўленні намечаных мерапрыемстваў па дастойнай сустрэчы 50-годдзя абароннага таварыства і VIII Усесаюзнага з'езда ДТСААФ.

**ШВЯЦОВА Ірына**



**ГВОЗДЗЕЎ Уладзімір**



**РУБАН Ігар**



Гэта паведамленне было зусім нечаканым. У яго не хацелася верыць. Не хацелася змірыцца з тым, што больш ніколі сярод нас не будзе шчырай і непасрэднай Ірыны Швяцовай, задушэўных сябрукоў - аднакурснікаў Уладзіміра Гвоздзева і Ігара Рубана. Жыццё іх абарвалася трагічна і вельмі рана. У дзень гібелі Ігару споўнілася роўна 18 гадоў. Толькі дзевятнаццаты год ішоў Ірыне і Уладзіміру. І вось такі рэдкасны, да моцнай болі сціскаючы нашыя сэрцы выпадак...

Глядзім на партрэты, акаймаваныя чорнай стужкай, а перад намі нашы юныя таварышы стаяць, як жывыя. Мы заўсёды ганарыліся Уладзімірам Гвоздзевым. Ён быў выдатнікам вучобы, сакратаром камсамольскай арганізацыі другога курса аддзялення арганізацыі механізаванай апрацоўкі эканамічнай інфармацыі. Гэта быў сціплы і чулы студэнт, здольны арганізатар. Ён любіў мастацкую самадзейнасць, з'яўляўся душой танцавальнага калектыву. Сёлетнім летам Уладзімір плённа папрацаваў у студэнцкім будаўнічым атрадзе «Юнацтва», дзе быў камісарам.

Як любімец усяго курса ў памяці студэнтаў застаўся Ігар Рубан. Усеагульнае прызнанне і павагу ён заваяваў за чуласць і таварыскую вернасць, сваю пастаянную дабрату. Ён таксама не ўяўляў свайго жыцця без мастацкай самадзейнасці, уваходзіў у састаў вакальна-інструментальнага ансамбля, захапляўся народнымі танцамі. Як і Уладзімір, летам Ігар працаваў у будатрадзе «Юнацтва», зарэкамендаваў сябе добрым майстрам.

Самыя цёплыя ўспаміны засталіся на кафедры эканомікі працы аб Ірыне Швяцовай, дзе яна працавала лабаранткай.

Цяжка і вельмі цяжка нам усведамляць тое, што мы страцілі такіх слаўных рабят. У сваіх сэрцах мы назаўжды захаваем аб іх светлую памяць.

**Група таварышаў.**

## РЭХА ПРАЦОЎНАГА СЕМЕСТРА-76

# ПОПЛЕЧ З СЯБРАМІ

Дружбе, калі яна па-сапраўднаму моцная і бескарыслівая, вялікая адлегласць — не перашкода. У гэтым не цяжка пераканацца. Добрых і шчырых сяброў набылі студэнты нашага ўніверсітэта ў чэшскім горадзе Чэске-Будзеёвіцэ. Пачынаючы з 1972 года, стала традыцыяй праводзіць абмен студэнцкімі будаўнічымі атрадамі паміж ГДУ і Вышэйшай сельскагаспадарчай школай Чэске-Будзеёвіцэ. У сумеснай працы за час трэцяга, працоўнага семестра, які інтэрнацыянальныя атрады праводзяць на беларускай і чэшскай зямлі, правяраецца трываласць сяброўскіх сувязей, лепш пазнаюцца характары студэнтаў.

У гэтым годзе 10 прадстаўнікоў нашага ўніверсітэта выязджалі ў Паўднёвачэшскую вобласць, дзе разам са студэнтамі ЧССР і ГДР працавалі на будаўніцтве цялятніка ў Кладна. Нашы рабяты на чале з камандзірам В. Крукоўскім і камісарам М Піскуном пакінулі аб сабе на чэшскай зямлі добрую памяць. Сведчаннем гэтаму служаць шматлікія ўзнагароды, якія яны прывезлі ва ўніверсітэт.

У сваю чаргу дзесяць чэшскіх сяброў з Вышэйшай сельскагаспадарчай школы г. Чэске-Будзеёвіцэ разам са студэнтамі механіка-матэматычнага факультэта ГДУ праводзілі свой працоўны семестр у Гомелі. Інтэратрад «Дружба-76» працаваў у СБМУ-3 трэста «Белсувязьбуд». Яго байцы капалі траншэі і клалі трубы пад тэлефонны кабель.

У першыя выхадныя дні чэшскія сябры пазнаёміліся са славутасцямі нашага горада, пабывалі на месцы дыслакацыі былога партызанскага атрада «Бальшавік» у Крынічцы. Знаёмства чэхаў з нашай рэспублікай працягвалася ў горадзе-герoі Мінску. Там яны былі гасцямі студэнтаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, наведалі дом-музей І-га з'езда РСДРП, музей Вялікай Айчыннай вайны.

У час культурнага тыдня чэшскія студэнты выязджалі ў Крым. Іх гідам быў камандзір інтэратрада В. Яцук. У Ялце яны зрабілі экскурсію ў дом-музей А. П. Чэхава, у палац, дзе ў гады Вялікай Айчыннай вайны праходзіла Ялцінская канферэнцыя. Цікава і захапляльна прайшла экскурсія па Крымскаму запаведніку, Бахчысарайскаму палацу. Ад імя сваіх таварышаў кіраўнік чэшскай групы Нэда Янакава шчыра падзякавала беларускіх сяброў за добрую арганізацыю ўсіх культурных мерапрыемстваў.

А ў Гомелі вольны ад працы час быў запоўнены цікавымі справамі. Так, адбыўся камсамольскі сход «Твой камсамольскі білет», на якім чэшскія сябры расказалі аб гісторыі сацыялістычнага саюза моладзі Чэхаславакіі, а нашы рабяты — аб гісторыі ВЛКСМ. Кожны вечар у інтэрнаце, дзе жылі байцы інтэратрада «Дружба-76», гучалі песні на рускай, беларускай і чэшскай мовах. Запамяталася ўсім і экскурсія на завод «Гомсельмаш», дзе мы сустрэліся з кіраўнікамі, камсамольскім актывам, перадавікамі вытворчасці прадпрыемства, паездка ў піянерскі лагер «Агеньчык» завода сантэхабсталявання, дзе ў той час адпачывалі чэшскія піянеры. Выязджалі мы і ў калгас «Перамога» Гомельскага раёна дапамагаць сельскім працаўнікам у нарыхтоўцы кармоў.

Актыўны ўдзел байцы атрада прынялі ў вечары інтэрнацыянальнай дружбы, арганізаваным у гонар прыбыцця ў Гомель аўтапоезда «Дружба». Тады ў нас з'явілася шмат новых сяброў з краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі.

...Хутка праляцеў месяц. Надышоў час развітання з дарагімі чэшскімі сябрамі. На памяць аб незабыўных днях, праведзеных байцамі атрада «Дружба-76», быў арганізаваны вечар інтэрнацыянальнай дружбы.

**Н. ТРАЦЦЯК,**
**камісар атрада «Дружба-76», студэнтка 5-га курса механіка-матэматычнага факультэта.**



**На здымку: байцы інтэратрада каля Вечнага агню ў Гомелі.**

# СТУДЭНЦКАЯ ВАХТА ПЯЦІГОДКІ

Застаўся ззаду першы працоўны семестр дзесятай пяцігодкі — пяцідзесяцідзённая вахта Усесаюзнага атрада. Лета кароткае, а планы былі вялікія. Поспех залежыў ад працалюбства кожнай пары рук, ад напоўненасці кожнай мінуты. Гэта разумелі ўсе байцы атрада «Саюз» эканамічнага факультэта, якія ў трэці раз выязджалі на будоўлі, трэці год станавіліся на студэнцкую вахту.

Працоўны семестр з-за тэхніка - эканамічнай практыкі ў байцоў атрада пачаўся са спазненнем. Нам прыйшлося працаваць больш хуткімі тэмпамі, чым астатнім будатрадам.

Месца нашай работы — зверасаўгас «Мірны» Гомельскага раёна. Мы будавалі жыллё для норак. З такой справай рабяты раней не сустракаліся. Усім спатрэбілася набываць новыя прафесіі.

Жыццё атрада было падпарадкавана строгай дысцыпліне. Кожнай раніцай дваццаць загарэлых, мускулістых рабят выбягалі на фіззарадку. А як сонца ўзнімалася над вершалінамі сосен, мы накіроўваліся да месца работы. Атрад быў разбіты на чатыры брыгады, кожная з якой спецыялізавалася на адведзеным участку. Гэта дапамагло ў лепшай арганізацыі працы. Дзённыя нормы намі заўсёды перавыконваліся. У гэтым вялікая заслуга ўсіх байцоў атрада, асабліва яго камандзіра П. Грыба.

Як і ўсе будаўнічыя атрады, мы праводзілі грамадска-палітычную і выхаваўчую работу. Прывядзем некалькі лічбаў: прачытана 8 лекцый, дадзена 4 канцэрты, праведзены 2 камсамольскія сходы разам з мясцовай камсамольскай арганізацыяй, перадзена больш 160 кніг сельскай бібліятэцы. Тут трэба адзначыць вялікія арганізатарскія здольнасці камісара атрада В. Каржова.

Кожную нядзелю байцы атрада выязджалі дапамагаць саўгасу на ўборцы сена.

За час трэцяга, працоўнага семестра намі асвоена 80 тыс. рублёў капіталаўкладанняў. Гэта амаль у два разы перавышае нашы сацыялістычныя абавязацельствы.

Усе байцы СБА «Саюз» запэўніваюць, што і працоўны семестр-77 яны правядуць з такімі ж поспехамі.

**В. ЗАЙЦАЎ,**
**камсорг СБА «Саюз».**

## ПАСЛЯ ПРАЦЫ—НА АДПАЧЫНАК

Плённа папрацавалі байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў у час працоўнага семестра-76. Яны пакінулі аб сабе добрую памяць у калгасах і саўгасах сонечнай Малдавіі і Беларусі, у будаўнічых арганізацыях Гомельскай вобласці, і пасля напружаных дзён ударнай працы заслужылі права на адпачынак.

Аб тым, каб ён прайшоў карысна, цікава, паклапаціліся ў прафкоме ўніверсітэта. Лепшым байцам СБА выдзелены шэсць пуцёвак у дом адпачынку «Чонкі», тры — у пансіянат «Свіцязь», дзве — у санаторый імя У. І. Леніна ў Бабруйску. Аматары турызму атрымалі пуцёўкі да Азоўскага мора.

НА АРХЕАЛАГІЧНАЙ ПРАКТЫЦЫ

# ДАКРАНУЛІСЯ ДА ЧАСЦІНКІ МІНУЛАГА

Своеасаблівым вянцом мінулага навучальнага года для першакурснікаў гістарычнага аддзялення з'явілася археалагічная практыка. Адразу ж пасля апошняга экзамена студэнты выехалі на месца раскопак: адна група — у в. Кісцені Рагачоўскага раёна, другая — пад Жлобін.

Далучэнне да практычнай археалогіі пачалося з правядзення археалагічных разведак, у якіх удзельнічалі В. Пічукоў, С. Гузоўская і іншыя студэнты. Справа гэта — здавалася б не хітрая — патрабавала ад практыкантаў працалюбства, цярплівасці і, натуральна, зацікаўленасці. Студэнты высвялялі знаходжанне таго або іншага помніка па дадзеных пісьмовых крыніц. І заўсёды радасць апісання зафіксаванага помніка была падобна радасці першаадкрывальніка.

На жаль, не ўсе помнікі захаваліся. Таму ў гэтым сэнсе асаблівую каштоўнасць будзе мець «Закон аб ахове помнікаў гісторыі і культуры», праект якога распрацоўваецца Савецкім урадам.

...Першы этап работы пройдзены. Рабяты выязджаюць на непасрэднае месца раскопак. Тут, на поўначы Гомельшчыны, выяўлена вялікая група курганаў XII ст. Жыццё ў палатцы, вечары ля кастра, бясспрэчна, маюць сваё хараство. Не менш рамантычнай была і наша праца. Спачатку мы дзейнічалі рыдлёўкамі. Імі здымалі невялікі пласт зямлі, пасля чаго ў ход пускалі ўласныя рукі і пэндзлікі.

Па меры заглыблення ў грунт мы ўсё больш напружваліся — дзесьці тут павінна быць знаходка. Лязг рыдлёўкі — і вось кераміка. Пэндзлікамі акуратна ачышчаем чарапкі з тыповым славянскім арнаментам — лінейнахвалявым. Рыхтуем «падушку» пад знаходкі, бо ўсё трэба зафіксаваць, апісаць, таму што размяшчэнне знаходкі мае вельмі вялікае значэнне. Затым сабіраем чарапкі. Іх склейваем, атрымоўваецца амаль цэлы сасуд. Валодзя Літвінаў і Віця Пічукоў у захапленні — яны вялікія аматары і знатакі ганчарнай вытворчасці.

Знаходкі іншых сасудаў менш поўныя. Склеіць іх цяжка. Дарэчы, кераміка сустракаецца амаль у кожным кургане, аднак удача спадарожнічае археолагам не заўсёды. Можна раскапаць курган і знайсці толькі шкілет (здаралася і так), або курган акажацца пустым — у плямён, якія жылі на тэрыторыі нашай Беларусі, быў звычай насыпаць сімвалічны курган у гонар сапляменнікаў, загінуўшых далёка ад радзімы.

Да ліку нашых знаходак адносяцца пазалочаныя пацеркі, жаночыя ўпрыгожванні таго часу (завушніцы), штосьці нагадваючае металічны нож. У кожнага з нас былі розныя пачуцці, калі мы сваімі рукамі адкрывалі позгляду гэтыя прадметы. І разам з тым усіх нас аднолькава ўразіла тое майстэрства, з якім яны былі зроблены, іх хараство нават для нашага часу.

Не абыходзілася і без гумару: пасля старанных раскопак у кургане выяўлялі шкілет сучаснай жывёліны, трапіўшай туды пасля падзяжу.

Аднак тое, што мы адшукалі, не было яшчэ самым важным. Галоўнае заключалася ў адпрацоўцы методыкі раскопак, якая залежыць ад віда помніка. Мае сваю методыку і раскопка курганаў. Яго раскапваюць па сектарах, так, каб у плане заставалася перакрыжаванне, дзе звычайна знаходзяцца рэчы, якія выкапваюць у апошнюю чаргу.

Стамляльнай, але вельмі важнай была здымка страціграфіі курганаў. Справа ў тым, што пасля ачышчаючага кастра і памінак па нябожчыку застаецца попельна-вугальны пласт, становішча якога і трэба зафіксаваць.

На практыцы нашым рабятам у многім дапамагаў энтузіязм мясцовага насельніцтва, яго зацікаўленасць да ходу раскопак. Студэнты ахвотна дзяліліся ведамі па археалогіі, растлумачвалі неабходнасць ашчадных адносін да помнікаў мінулага.

Археалагічная практыка першакурснікаў прайшла захапляльна. Будучыя гісторыкі ўжо з першага года вучобы з цікаўнасцю дакрануліся да часцінкі мінулага.

**М. БАНАДЫКАЎ,**
**студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**



**НА ЗДЫМКУ: раскопкі кургана вядуць студэнты С. ГУЗОЎСКАЯ, В. ЛІТВІНАЎ, М. БАНАДЫКАЎ.**



**З кожным годам прыгажэе і добраўпарадкоўваецца Гомель. За апошні час вялікія работы выкананы па вуліцы Савецкай. Прыемна ісці па яе тратуарах.**

Кніжная паліца

# «...АКНО І СЭРЦА АДЧЫНІЦЬ У ДЗЕНЬ НАСТУПНЫ, НЕПРАЖЫТЫ...»

Сёння ўсім вядома імя песняра зямлі палескай, яе жыватворных крыніц і жытнёвых палёў Міхася Рудкоўскага. І я магу смела заявіць, узяўшы ў рукі яго апошні зборнік «Векавечная бацькаўшчына», што ніхто з сучасных маладых паэтаў так глыбока і з такой вялікай любоўю не прысвяціў нашаму роднаму Палессю стольскі радкоў сваіх вершаў.

Міхась Рудкоўскі працуе на студыі тэлебачання г. Брэста. Ён шмат ездзіць па Беларусі, добра ведае маляўнічыя мясціны, багатыя сваёй гісторыяй, сцяжынкі, ведае шмат працавітых паляшукоў, чыя слава далёка пераступіла межы вобласці і рэспублікі. Напрыклад, калгас ордэна Леніна «Аснежыцкі», у якім працуюць дзевяць Героеў Сацыялістычнай Працы.

Калі чытаеш вершы Міхася Рудкоўскага, дык быццам сам вядзеш гаворку з паэтам і яго героямі. Пра родны край ён гаворыць проста і ясна, як гаворыць сын пра родны кут, пра сваіх бацькоў, пра дом, які даў сілу і смеласць і выправіў у жыццёвы шлях.

**«Тут я жыву! П'ю, ем,**
**начую.**
**Грахі душы сваёй**
**карчую**
**У промнях сонца і расы.**
**Тут дух зямлі здаровы**
**бродзіць**
**І на вачах маіх**
**узыходзіць**
**Трава лясная — дзівасіл»**

Новы зборнік Міхася Рудкоўскага ўвогуле прысвячаецца калысцы нашай —зямлі палесскай.

**«Вяртаюся я ў край свой**
**дарагі**
**— Дзень добры, баравыя**
**ў стыні сосны!**
**Дзень добры вам,**
**на верасах снягі,**
**І вам, ля хаты роднае**
**бярозы!»**

Старонку за старонкай перагортваю зборнік. Перад намі ўсё новыя і новыя вершы. Сустракаюцца і тыя, якія раней даводзілася чытаць у газетах і часопісах. Але тут яны набываюць асаблівы сэнс, ды калі яшчэ доўгі час не быў дома, а прыехаў — і здалося, што тут і птушкі ў лесе спяваюць неяк па-асабліваму. І ты зусім іншымі вачыма глядзіш на тую самую бярозку, што пасадзіў каля школы ў далёкім дзяцінстве. І нешта новае адчуваеш у душы, калі чытаеш верш «Балада пра белы камень», які стаў поперак дарогі перад танкам з чорным крыжам на броні. А вершы «У лясах», «Граніца», «Хутчэй к нам на Палессе прыязджай» прымушаюць зусім інакш глядзець на акаляючы свет, па-бацькоўску клапаціцца аб кожным жытнёвым каласку, аб кожнай зялёнай галінцы ў лесе.

Вершы Міхася Рудкоўскага клічуць чытачоў, вядуць па чыстай роснай траве ў бярозавы гай і дубравы, да блакітных, як само неба Палесся, азёраў, да крыніц, якія ў гады вайны высыхалі ўмомант, калі з іх хацеў напіцца вораг і ў той жа час давалі сілы партызану, які вяртаўся з баявога задання.

Міхась Рудкоўскі піша проста і даступна. Вершы яго — гэта душа чалавека з Палесся. У іх няма «піжонства і браварства», няма рыфм, замешаных на вадзе, таму што сам аўтар вырас на Палессі, і людзі гэтых месц, куды «...з далечыні лятуць здаўна буслоў і жураўоў ключы-чароды...» не прымуць пустой пісаніны.

Усе змешчаныя ў зборніку вершы заслугоўваюць самай высокай пахвалы. Але мне найбольш спадабалася «Балада пра камету». Аўтар вядзе сказ пра «хлопца з-пад Брэста Пятра Клімука».

Міхась Рудкоўскі пачаў і заканчвае свой зборнік вершамі пра лугі і пралескі, пра верасы і васількі, дзе ён зрабіў свае першыя крокі, дзе

**«Над позняй шэранню**
**палёў.**
**Над партызанскай пушчай**
**мілай —**
**Надыдзе час —**
**шыракакрыла**
**Узняцца ў неба жураўлём.**
**І — круг за кругам —**
**ў тую яснасць.**
**Дзе нібы промень**
**кожны міг.**
**На шчасце тое ці**
**няшчасце.**
**А сонца ўзяць глыток і**
**ўпасці**
**На курганы дзядоў сваіх».**

Зараз малады паэт працуе над новымі вершамі. Пра яго можна смела сказаць, што ён заўсёды гатоў «...акно і сэрца адчыніць у дзень наступны, непражыты...».

**Г. КАРНАЧ,**
**студэнтка групы Б-13 гісторыка-філалагічнага факультэта.**

*Прырода і ты*

# ШЧОДРАЯ ВОСЕНЬ

Мой аднакурснік і сябар Рыгор — заўзяты грыбнік. Яго, як кажуць, хлебам не кармі, дай толькі паблукаць у лесе за прыгажунамі-баравікамі. Такі ўжо ў чалавека характар. Аднойчы ён прапанаваў і мне схадзіць з ім па грыбы. Я з радасцю згадзіўся. У нядзелю раніцай мы былі ўжо далёка ад горада і накіроўваліся да сінеючага лесу.

...Восеньскі золак. На небасхіле застылі празрыстабелыя воблакі. Чыстае паветра асвяжае твар, санлівасць знікае і ісці становіцца лёгка. Паплавы змяняюцца засеянымі ўчасткамі азіміны, збок поля стаяць сціrты саломы. Каля адной з іх заўважаем ліcу. Яна так заюшылася, што нават не глядзіць па баках. Калі б убачыла нас, няйначай уцякла б. Ліса корпаецца ў саломе, скача з месца на месца. Гэта рыжая хітруня палюе на мышэй. Цяжка стрымацца, і мы крычым: «Туга, туга!». Ліса ўзняла галаву, настрыла вушы, нюхае сваім вострым доўгім носам паветра і, заўважыўшы нас, з усіх ног кідаецца ў бок лесу. Толькі і бачылі яе.

Узыходзіць сонца. Зіхаціць і пераліваецца колерамі вясёлкі росная трава. Раса не спяшаецца знікнуць. Але сонца няўмольнае. Яно усё прыпякае. І тады пакрыўджаная раса блакітнымі слязінкамі скочваецца па травінках долу.

Вось і лес. Мы разыходзімся ў розныя бакі на ладную адлегласць, каб не бегаць удваіх за адным грыбам. Пачынаем шукаць баравікі. Доўга мой кошык пустуе — грыбы ад мяне хаваюцца, і ўсе мае стараннi пакуль што дарэмныя.

Складваю далоні і крычу:

— Рыгор! Колькі знайшоў?!

— Гор! Шоў! — адзываецца рэха.

— Ну, чаго раскрычаўся? Няйнакш поўны кошыкназбіраў?

Гэта Рыгор. Ён, як тая ліса, ціхенька падыйшоў аднекуль збоку і пацяшаецца з гора-грыбніка. У яго кошыку я заўважаю некалькі баравікоў. «Бач, ты! Калі і паспеў столькі?».

Разыходзімся зноў. Цяпер я ўжо больш уважліва прыглядаюся па баках, падымаю яловыя лапкі і... грыб, вялікі белы баравік! Апантаны ўдачай, шукаю грыбы яшчэ пільней. Яны ўжо не хаваюцца ад мяне.

Нечакана наперадзе пачуўся трэск сухога галля. Цікава: хто гэта збірае мае баравікі? Гляджу і не веру — ці не прывід? Не, ява. На невялікай палянцы стаяць трое — ласі. Ён, з вялікімі моцнымі рагамі. — Лічу: іх — шэсць. Столькі ласю гадоў. Крыху меншая ласіха і ласянё. Стаяць і слухаюць. Затаіўшы дыханне, гляджу на іх і любуюся — якія прыгожыя! Заўважылі мяне. Усе трое, нібы згаварыўшыся, у адзін скачок знікаюць у ельніку. Яшчэ доўга стаю, уражаны нечаканай сустрэчай.

Збіраць грыбы ўжо чамусьці не хочацца. Думаю пра ласёў. А непадалёк заўважаю рабіну. Сярод зялёнага ельніку яна нібы агонь. Прыгадваюцца радкі С. Ясеніна: «В саду горит костёр рябины красной...» А вунь яшчэ... Хаця гэта не рабіна, гэта — каліна. Знешне яна падобна на рабіну, толькі ягады ў яе буйнейшыя і не такія кіслыя. Вось ласунку птушкам!

Крыху далей у лесе — дубняк. Колькі тут жалудоў! Заўважаю парытыя мясціны. Гэта дзікі прыходзілі ласавацца жалудамі. Трапляюцца кусты арэшніку. Тут ужо і самога спакушаюць спелыя арэхі.

Непадалёк — бярозавы гай. Жоўтыя, нібы пазалочаныя, стаяць бярозы. Няйначай сонца сыпанула ім жменю свайго зыркага бляску.

...Мы вярталіся з грыбоў, калі сонца садзілася да небасхілу. З вышыні неба раптам пачуўся жураўліны крык: «Курлы, курлы...» Птушкі адляталі ў вырай.

Вось такая яна, зачароўваючая восень.

**А. ШВЕДАЎ,**
**студэнт 2-га курса гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**Рэдактар Ул. БАЛОГА.**

**Рэктарат, партком, камітэт ЛКСМБ, прафком, дэканат эканамічнага факультэта, выкладчыкі і студэнты ўніверсітэта глыбока смуткуюць з выпадку трагічнай гібелі лабаранткі кафедры эканомікі працы Ірыны ШВЯЦОВАЙ, студэнтаў гр. 0-21 Уладзіміра ГВОЗДЗЕВА і Ігара РУБАНА і выказваюць глыбокае спачуванне іх бацькам і родным.**

АЗ 05590

**«Гомельский университет» — орган парткома, ректората, комитета ЛКСМБ, профкома и месткома Гомельского государственного университета (на белорусском языке). Гомельская фабрыка «Палесдрук» Дзяржкамітэта Савета Міністраў БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю, Гомель, Савецкая, 1. Аб'ём — 1 друк. аркуш. Наш адрас: вул. Савецкая, 104, галоўны корпус ГДУ, П. 5-3, Т. 6-27-71. Фармат 600×420 мм. Тыраж 2000 экз.**

Заказ 6055.